НАШАЕ ЖЫЦЬЦЁ

Цана асобнага нумару 800 м. п.

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12 п. 6 (Wileńska 12, m. 6).

Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 штодня апрача сьвяточных дзён.

Выходзіць тры разы у тыдзень.

Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 9000 м.п. Для заграніцы ўдвая даражэй.

Няпрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукованага залежыць ад рэдакцыі.

Цана абвестак: перад тэкстам 1000 мк., сярод тэксту 800 мк. і на 4 стрніцы 600 мк. за радок петыту ў 1 шпальт.

№ 3 | Субота. 2-га чэрвеня 1923 г. | Год I.

ПРАЦЭС БЕЛАРУСАЎ у БЕЛАСТОКУ.

(Ад уласнага карэспандэнта)

Грыгор Каляда.

Двойчы ўспамінаецца ў знойдзеных у „канцэляры" Шыманюка дакумэнтах:

1) у сьпіску прынятых на пэнсыю, як афіцэр для лучнасьці і

2) на так званай „liście płacy" «служачых отд. lit. g за месяц люты 1922 г.» пад мянюшкай Барысаў Грыгор, łącznik. 600.

Па словах сьведкі Шыгаловіча (не зьявіўся), прыймаўшага удзёл у арганізацыі, а пасьля выдаўшага яе паліцыі, Грыгор Каляда, завэрбованы ў арганізацыю праз Станкевіча, езьдзіў у штаб V групы, дзе Разумовіч-Хмара пагрозамі заставіў яго паступіць у партызанскі атрад; прывёз з Мэрача 200.000 мар. польск. і дзьве „машыны для ўзрыву мастоў".

Абвінавачаны Лукашук паказаў, што Грыг. Каляда гаварыў яму ў студзені 1922 г. аб тым, што вясною разгарыцца паўстаньне і угаварываў увайсьці ў арганізацыю.

Абвінавачаны Грыгор Каляда ня прызнае сябе вінаватым, удзелу ў арганізацыі ня браў; стрэдняга брата свайго Лукашука не намаўляў; ня ведае нават дзе Мэрач; аб машынах для ўзрыву мастоў нічога ня чуў.

Грыгор Астроускі.

Жыхар м. Крынкі, Горадзенскага пав.

Абвінавічаньне цалком збудована па паказаньнях правакатара Ленкевіча, па славах якога Парук пазнаеміў яго з Астроўскім у палове лютага 1922 г. у сябе ў школе ў Горадні, адракамандаваўшыся, як начальнік району ў Крынках. Астроўскі павінен быў арганізаваць атрад, які, быццам, меў заданьне з пачаткам паўстаньня заняць Саколку. Правакатар Міхнюк паказаў, што сам Станкевіч заўсёды радзіўся з Астроўскім.

На дапросе ў паліцыі Астроўскі прызнаўся, што належыць да арганізацыі і атрымаў, як сябра яе, ад А. Парука 5.000 м. п.

У судзебнага сьледаваццеля Астроўскі гэтыя свае паказаньні адкінуў. Прышоўшы 19 лютага 1922 г. да Парука і заставшы ў яго незнаёмага яму да таго часу Ленкевіча, Астроўскі пазваў у другі пакой Парука і папрасіў пазычыць яму 1.000 мар. Парук даў яму 5.000, але папрасіў прызнаць сябе перад Ленкевічам сябрам арганізацыі і сказаць, што ў Крынках справа йдзе добра, бо іначай Ленкевіч скажа ў Мэрачы, што Парук нічога ня робіць у арганізацыі. Маючы патрэбу ў грошах, Астроўскі згадзіўся сказаць гэта.

Дапрошаны на судзе Астроўскі заявіў, што ў арганізацыі удзелу ня браў і зьяўляецца ахвярай абгавору. Грошы ўзятыя ў Парука пазычыў і аддаў яму пры першай магчымасьці.

Мацей Грыгас.

Ж. в. Даўжэлі, гм. Марцінканцы, Троцкага п. літовец.

Даныя акту абвінавачаньня:

Дзейны сябра арганізацыі ў ролі перавошчыка праз літоўскую граніцу загаворшчыкаў, якія езьдзілі туды і назад.

Ленкевіч і шэраг абвінавачаных, як Сьцяпан Жабінскі, А. Шыманюк (растраляны), Яз. Захарчук, Андрасюк паказалі на сьледзтве, што Грыгас перавозіў іх за плату праз граніцу, хаваў агітацыйную літэратуру.

У часе вобыску знойдзена:

1) 4 квітанцыі ўсяго на суму 25.000 м. п. за правоз праз граніцу над рожнымі мянюшкамі сябраў арганізацыі.

2) 1 беларуская брашура адозвы ўраду Ластоўскага з прычыны выбараў у Віленскі Сойм з таго „складу" літэратуры, аб якім на дапросе паказаў Андрасюк.

На пытаньні суда Грыгас адказаў, што вінаватым сябе ня лічыць, да арганічацыі не належаў, а, жывучы ў 10 верстах ад граніцы, займаўся перавозам праз яе розных асоб, маючы на мэце толькі камэрцыйную выгаду. Квіткі выдаваў па просьбе тых асоб, якім па іх словах, яны былі патрэбны для рахункаў, яны называлі сябе кооператарамі і інш.

Пракурор. Ці езьдзілі ў Мэрач?

Грыгас Езьдзіў на рынак.

Прадс. Значыцца абвінавачанаму не вядомы былі мэты арганізацыі, якой ён рабіў услугі сваімі перавозкамі?

Грыгас. Не

Прадс. Ці перавозіў праз граніцу Веру Маслоўскую?

Грыгас. Два разы.

Прадс. А Аўгеню Матэйчук?

Грыгас Ні разу.

Прадс. А Жабінскага?

Грыгас. Адзін раз.

Прадс. А Якавюка?

Грыгас. Не.

На пытаньне абаронцы Славінскага абвін. Грыгас кажа, што перавозіў шмат пасажыраў з багажом на абодва бакі з Польшчы ў Літву і з Літвы ў Польшчу часта з багажом на вазох, што тлумачыцца вялікімі кірмашамі ў Мэрачы, куды шмат езьдзіла з польскага боку граніцы Прозьвішчаў пасажыраў ня пытаўся. Зьместу брашуры ня ведае — знайшоў на вуліцы.

Аляксандар Гораш.

Крамнік у Саколцы, бyўшы афіцэр расейскай арміі.

Абвінавачываецца на падставе паказаньняў правакатара Ленкевіча, Андрэя Каляды і Жамойды.

Па словам Ленкевіча Гораш у сваей крамцы, гандлюючы гарэлкай, вэрбаваў праваслаўных беларусаў прызыўнога веку і вёў агітацыю сярод жаўнераў польскай арміі, прыходзіўшых да яго крамкі, каб яны пераходзілі на літоўскі бок і паступалі там у беларускія палкі. Езьдзіў у Мэрач і прывёз адтуль 4 рэвальвэры і грошы на агітацыю.

Андр. Каляда паказаў, што Гораш часта езьдзіў у Мэрач і прывозіў грошы; паказваў яму, Калядзе, 2 загады з даручэньнем зьбіраць весткі аб аружных сілах Польшчы.

Жамойда паказаў, што Гораш нагаварваў яго ўвайсьці ў арганізацыю і прынёс яму 2 загады Хмары, шыфр і ключ да яго.

Пры вобыску ў Гораша знойдзены рэвальвэр сыст. Para bellum з 19 патронамі і выдраны з кніжкі алфавітны сьпіс польскіх афіцэраў на літ. Н.

На пытаньні суда Гораш адказаў, што да арганізацыі не належаў. У Мэрач ня езьдзіў, аб рэвальвэры сам заявіў паліцыі, рэвальвэр у яго даўно; 16 гадоў быў афіцэрам расейскай арміі і 2 гады польска-беларускай

Маслоўская запраўды прапанавала яму ўвайсьці ў арганізацыю, але ён адмовіўся. Жамойду не намаўляў.

На пытаньне пракурора адказаў, што занадта стары і мае вялікі досьлед, каб незнаёмых яму жаўнераў, што прыходзяць да яго ў крамку за пакупкамі, намаўляць да дэзэртырства, рызыкуючы ўсім сваім дабрабытам і сям'ёю. Рабіць усё гэтае пад пільнай увагай польскай улады было-б занадта небясьпечным.

Александар Станкевіч (Пугачоу).

Акт абвінавачаньня лічыць Станкевіча адным з галоўных дзеячоў арганізацыі Дзейнасьць яго высьветлена агентам Міхнюком, увайшоўшым у арганізацыю пад мянюшкай „Пэрсіянаў".

У часе вобыску знойдзена:

1) Karta powołania на імя Васілеўскага, якога Станкевіч завэрбаваў у беларускі полк у Літве.

2) Карта Горадзеншчыны „Нямец. Ген. Шт."(?) з адзначанымі вёскамі і мястэчкамі.

3) Некалькі адозваў Хмары, прызываючых беларусаў да паўстаньня проціў Польшчы.

4) Інструкцыя для пяхоты, пісаная ў беларускай мове.

5) Надрукованая на шапірографе інструкцыя для начальнікаў аддзелаў.

6) Пісаная парасейску загаворшчыкам Захарам Леваненя („Лебедзеў") запіска, ў якой былі весткі аб меўшай быць мабілізацыі і аб мосьце цераз Сьвіслач, з прапазыцыяй прыбыць у Бераставіцы.

7) Пісьмо Станкевіча Уладзіміру Шэдка з даручэньнем закончыць да 20—IV арганізацыю Галынскай гміны і партызанскага атраду. У пісьме рэзкія сказы адносна да палякаў і указаньне на прыналежнасьць пісаўшага да Р. К. П. бальшавікоў.

8) Пісьмо да Міхнюка—„Пэрсіянава" „Пугачова" (мянюшка Станкевіча), ў якім апошні просіць прыстаўленага да яго правакатара „як найхутчэй законьчыць арганізацыю Індурскага району", начальнікам якога быў Міхнюк, паведамляючы, што „за аружжам пасланы чалавек".

9) Рэвальвэр новы сыст. Para bellum з 11 патронамі, 10 патронаў да стрэльбы, лента ад кулямёту.

Сьведка Уладз. Шэдка паказаў, што Станкевіч напісаў яму пісьмо з прапазыцыяй увайсьці ў баявую арганізацыю. Сьв. Рудзян паказаў, што Станкевіч гаварыў яму пра арганізацыю, аб 2 захаваных кулямётах. Сьведка Шыгаловіч (агент-правакатар) паказаў, што Станкевіч яго і яшчэ некалькі маладых чалавек прызыўнага веку асабіста адвёз у Штаб IV групы.

На пытаньне прадседацеля адказывае, што прызнае свой удзел у арганізацыі, але хоча высьніць прычыны, заставіўшыя яго зрабіць гэта. У Расеі служыў у „Пленбеже". Там пасьля Рыскага трактату было шмат агентаў Польскага Ураду, якія угаварывалі ураджэнцаў земляў, што адышлі да Польшчы, вярнуцца на Бацькаўшчыну, сулечы ўсялякія абяцанкі. Паверыўшы гэтым агентам, абвінавачаны вярнуўся ў сваю вёску Крынкі Горадзенскай зямлі. Але тут усё аказалася іначай, чым абяцалі агенты па рэпатрыацыі. Абяцалі дапамогу на адбудову зруйнаванай гаспадаркі, але ў гэтай галіне нічагусенька ня зроблена. Рэпатрыянты беларусы жывуць у зямлянках, як зьвяры, дзеці мруць з голаду і холаду.

За заяву ў гміне бяруць апошнія грошы, атрыманыя ад прадажы астаткаў маемасьці, а вынікам усяго гэтага—адмовы ў просьбах. Адмаўляючы казалі: невядома ці належыць Горадзеншчына да Польшчы, ці не і ці будзе належаць на пэўна ня ведаем.. Як выясьніцца..

Пасьля прышлі падаткі, даніны, якія сьцягівалі, прадаючы апошняе. Просьбы не памагалі... На хаўтуры ня было...

Прадс. Просіць гаварыць карацей і бліжэй трымацца пытаньня: чаму ўвайшоў у арганізацыю.

Станкевіч. Я і хачу выясьніць, чаму ўвайшоў у арганізацыю. Зіма была жудасная. Дзеці і кабеты замерзалі ў зямлянках, з холаду і голаду ў нас памёрла 405 чалавек...

А што польская, ўлада рабіла з нашымі школамі. Іх зачынялі, не давалі дзецям вучыцца на роднай мове...

Прадс. зноў зварочывае ўвагу, што гэта не мае адносін да ўступленьня ў арганізацыю.

Абаронца Станкевіча генарал *Бабянскі* заяўляе, што ўсе гэта проста адносіцца да прычын, папхнуўшых абвінавачанага на шлях рэвалюцыйнай барацьбы. Незадавальненьне праз уладу культурна-прасьветных і эканамічных патрэбаў беларускай людnасьці, акурат і выклікала ўсю гэтую „палітыку" і папхнула найбольш актыўныя элемэнты на іншыя мэтады барацьбы.

Абв. Станкевіч. Польскія вучыцялі выганялі беларускіх дзетак, якія хацелі вучыцца роднай мове...

Прадс. прапануе абвін. адказываць лепш на пытаньні суда.

Станк. адмаўляецца адказываць на пытаньні і пратэстуе проціў таго, што яму не дазваляюць даць свае аб'ясьненьні

Пракурор ссылаецца на закон, які забараняе рабіць з лаўкі падсудных на судзе трыбуну для антыдзяржаўнай агітацыі, клікаць да зьнявагі ўлады. Абвінавачаны карыстаецца судом для прапаганды камуністычных ідэй.

Абар. ген. Бабянскі устанаўляе, што ў словах абвін. Станкевіча ніякай камуністычнай прапаганды няма і просіць суд даць абвін. магчымасьць высказацца да канца.

Абар. Врублеўскі дамагаецца даць свабоду слова абвінавачанаму з пункту гледжаньня чыста юрыдычнага. Трэба даць магчымасьць падсуднаму вызсьніць суду ўнутраную суб'ектыўную старану праступленьня, калі яно мела мейсца. Практыка расейскага сэнату заўсёды стаяла на гэтым пункце гледжаньня. У расейскім судзе царскага часу на ўсіх палітычных працэсах, калі судзілі нават забойцаў самых высакапастаўленых асоб, заўсёды давалі падсудным высьвятляць да канца матывы праступленьня. Нават такі прадседацель, як Крашэннікаў, даваў магчымасьць абвінав. высказацца, ня лічучы гэтае выясьненьне суб'ектыўнага боку праступленьня агітацыяй. З гэтага чыста—юрыдычнага пункту гледжаньня абар. дамагаецца абвінавачанаму свабоды слова.

Пракурор энэргічна пратэстуе, падкрэсьліваючы, што дрэннага прыкладу з расейскіх судоў браць ня трэба. Прамова Станкевіча—тыпічна-агітацыйная прамова камуністычнага ўзору і яму застаецца толькі дзівіцца, што ў польскім судзе прадстаўнікі польскай адвакатуры выступаюць на абарону праціваўрадавай антыпольскай прапаганды, недапусьцімай для запраўднага польскага патрыота.

Абар. Міцкевіч горача пратэстуе проціў слоў пракура. Мы, прадстаўнікі польскай адвокатуры, магчыма, ня горшыя патрыоты, чым пракурор, але мы аб патрыятызме будзем гаварыць у другім мейсцы. „Мы прышлі ў польскі суд выясьніць судовую праўду, а не сачыць за патрыятызмам і польскасьцю адзін другога". Просіць суд даць магчымасьць абвінавачанаму свабодна выясніць суду матывы сваіх паступкаў.

Абар. Грушкевіч далучаецца да пратэсту проціў слоў пракурора. Польскі патрыятызм, як і ўсякі іншы, ня толькі не забараняе, але проста вымагае паказываць на недастаткі і непарадкі ў краі. Абвін. Станкевіч гаворыць проціў непарадкаў у Польшчы, але ня проціў Польшчы.

Абар. Славінскі з прысутнай яму дасьціпнай іроніяй замячае, што яго, як абаронцу па назначэньні ад суду, надта трывожаць і абражаюць падазрэньні ў сымпатыі да камуністычнай прапаганды. Дзеля гэтага ён быў-бы рад, каб прадседацель сьцвердзіў, што запраўды ніякай камуністычнай агітацыі ня было.

На ўсе гэтыя заявы *пракурор* маўчыць і *прадседацель* дазваляе Станкевічу гаварыць далей.

Станкевіч гаворыць аб даўнасьці беларускай культуры і пісьменнасьці, якая старэй за польскую, аб тым, што раз прабудзіўшыся народ ня можна задушыць, што нацыянальная сьвядомасьць беларусаў ня будзе зьвіштожана, што ён вярнуўся на Бацькаўшчыну каб памагчы роднаму народу змагацца за свае правы, і, калі барацьба пашла ня тым шляхам, якім магла-б ісьці пры нармальных варунках, дык у гэтым вінавата польская ўлада, а не беларускі народ.

На пытаньне пракурора прызнаецца, што рэвальвэр у яго быў знойдзены, але большасьць сваіх паказаньняў у сьледаваццеля адкідае. За падставу апошніх быў паложаны пратакол паліцэйскага дазнаньня. Абвін. падробна расказвае, як зроблены апошні. Ен быў арыштованы цэлым атрадам пяхоты на чале з вывядоўцамі. Пры арышце яго на мейсцы абабілі да паўсмерці . . . білі па твары і па чым папала . . . Паўжывога адвязьлі да пастарунку. Але быў прыказ везьці далей да Беластоку.

Абвін. падробна адзначае далейшыя пабоі і зьдзекі пры дапросе. Тут і гумовыя палкі і шэраг другіх—вядомых нам па царскай практыцы—прылад . . . Абвін. пратэстуе проціў таго, што ў пратаколе судз. сьледаваццеля папала ня толькі тое, чаго ён ня гаварыў, але і тое, што ён асабліва адкідаў. Падпісаў гатовы пратакол, баючыся далейшых пабояў і зьдзекаў.

Пракурор. Ці абвінавачаны належыць да камуністычнай партыі?

Станк. Не належаў у Расеі, не належу і ў Польшчы.

Абв. Захар Леваненя.

(Лебедзеў) жых. в. Кошынцы Горадзенскага пав.

Удзел у арганізацыі акт абвінавачаньня ўстанаўляе на падставе вышэй прыведзенага пісьма Станкевіча і паказаньняў апошняга.

На пытаньні суда абвін. адказвае, што вінаватым сябе ня лічыць; што запраўды пісаў пісьмо да Станкевіча ў Бераставіцу ў засаду, каб выдаць паліцыі.

Карнэль Масальскі.

Жых. в. Грабавец, Бельскага пав.

Прозьвішча Масальскага зьмешчана ў сьпісу сябраў арганізацыі, знойдзеным у „крыювцэ" банды Скамароха: „Масальскі—25.000 м. п., за прадукты 5.000".

У памешканьні суда Масальскага па паказаньню сьвед. Краўчука, Шыманюк выплаціў на пачатку красавіка пэнсію сябрам арганізацыі ў Грабаўцы.

На пытаньне суда адмаўляецца ў удзеле ў арганізацыі. Шыманюка не знае, грошай не атрымліваў. Як папаў у сьпісак арганізацыі, ня ведае.

Аляксандар Андрасюк.

(Сердобскі) ж. в. Чэхі, Бельскага пав.

Прозьвішча абвін. зьмешчаны ў „сьпіску в Чэхі", знойдзеным у Скамароха. Аб удзеле ў арганізацыі для лучнасьці паміж арганізацыяй і Штабам IV групы паказаў абвін. Сымон Мацэевіч. Езьдзіў з Андр. Тамашуком у Даржэлі да Грыгаса.

Абвін. Андрасюк удзел у арганізацыі адкідае. На пытаньне прадс. чаму ён прызнаўся на дапросе у сьледаваццеля, Андрасюк заяўляе, што сьледаваццелю ён не гаварыў нічога, а як папала ў пратакол ягонае паказаньне ён ня ведае. На ўсе пытаньні адказывае адмоўна.

Антон Яудасюк (Сяргеенка).

Фэльшар в. Дабраводы Бельскага пав

Сярод дакумэнтаў „канцэляріі Скамароха" знойдзена падпіска, быццам, належачая да абвін. Яўдасюка, ў якой ён абецае „сумленна выпаўняць абавязкі фельшара для дабра Бацькаўшчыны і свабодных беларусаў".

На пытаньні суда адмаўляецца ў удзеле ў арганізацыі. Падпіскі ніякай не даваў. Закідаемая яму запіска пісана не яго рукою.

Клемусь Жамойда.

Псаломошчык праваслаўнай царквы ў Саколцы.

У часе вобыску знойдзена: лемантар Зорка з шыфрам на 42 стар., ключ да шыфру і надрукаваныя на шапірографе загады Хмары № 8 і 9; паказаньні абодных правакатараў Ленкевіча і А. Каляды, згодна паказываюць, што Жамойда быў у арганізацыі памоцнікам выдатнага сябра яе Гораша і вэрбаваў у сябры арганізацыі, паміж іншым і Андрэя Каляду.

На пытаньні суда выясьняе, што да арганізацыі не належаў і Гораш яму не прапанаваў увайсьці да яе. Угаварываў увайсьці ў склад арганізацыі Ленкевіч; ён і выдаў паліцыі. Як знайшліся ў яго лемантар, шыфр і загады Хмары ня ведае. Раз былі ў яго Ленкевіч з Горашам і Ленкевіч заставіў нейкі пакуначак. Хутка пасьля гэтага прыйшла паліцыя і пры вобыску знайшлі пакунак. Розьніцу паміж паказаньнямі на судзе і ў сьледаваццеля, выясьняе гэтак: „Следавацель запрапанаваў мне падпісаць гатовы пратакол паліцэйскага дазнаньня. Я адмовіўся, кажучы, што там няпраўда. Тады сьледавацель крыкнуў: „Milcz, psia krew!" і прыказаў падпісаць.

Пракур. Хто судзебны следавацель?

Жамойда. Ясінскі.

Пасьля перарыву пракурор заяўляе суду, што ім атрыманы новыя весткі аб дзейнасьці абв. Баранава ў характары ўжо пасла да Польскага Сойму. Камандант Горадзенскай Дзяржаўнай Паліцыі даносіць аб тым, што ў самы апошні час Баранаў, быццам, з паводу пасольскай справаздачы езьдзіў па Горадзеншчыне і заклікаў сялян да аружнага паўстаньня проціў Польшчы. Пракурор просіць суд выклікаць каманданта Горадзенскай паліцыі, ў характары сьведкі па цяперашняй справе.

Абаронца Баранава *Врублеўскі* з ўсей моцай пратэстуе проціў вызаву з боку абвінавачаньня новага сьведкі ў працягу працэса. У выпадку калі суд дапусьціць гэтага новага сьведку, абарона будзе дамагацца прадугледжанага законам 7 днеўнага тэрміну, каб прадставіць суду новых сьведкаў з боку абвінавачанага—для таго, каб спраўдзіць паказаньні новага сьведкі з боку абвінавачаньня, якія могуць быць няпраўдзівымі. Пазбавіць абарону і абвінавачанага законнага спосабу абароны проціў новых абвінавачаньняў суд ня можа, бо гэта значыла-б у карані нарушыць самую падставу суда—раўнапраўе старонаў.

Пракурор адказывае абар. Врублеўскаму, паказываючы, што суд дасьць абароне законны тэрмін (1 дзень), каб падгатавацца да дапросу новага сьведкі.

Абар. Врублеўскі адказывае пракурору, што справа йдзе не *аб тым*, каб падрыхтавацца да дапросу новага сьведкі, а аб тым, каб прадставіць суду сьведкаў абароны, якія-б адкінулі ў выпадку іх хвальшывасьці паказаньні сьведкаў абвінавачаньня. Палажэньне, створанае дамаганьнем пракурора, відавочна бязвыхаднае: суд ня мае цяпер магчымасьці даць нам законны 7-днёвы тэрмін дзеля прадстаўленьня нашых сьведкаў, а з другога боку пракурор ня можа паказаць ні аднэй стацьці ў законе, якая-б давала права суду скараціць хаця-б на дзьве гадзіны гэты 7 дн. тэрмін. Пракурор гавора аб зусім новых абвінавачаньнях, аб якіх няма ніводнага слова ў акце абвінавачаньня. Гэта зусім новае дзела. Найлепшы выхад з палажэньня гэта—справу Баранава з гэтага працэсу выдзеліць у асобную справу.

Пракурор зноў дамагаецца, каб дапусьціць новага сьведку, з прычыны асаблівай вагі і цеснай сувязі яго паказаньняў з цяперашняй справай, з абвінавачаньнямі, якія прад'яўлены Баранаву. Новыя праступленьні Баранава зроблены ім цяпер, ўжо будучы паслом, зьвязаным прысягаю вернасьці Польскай Рэспубліцы і паказаньні Каманданта Горадзенскай Паліцыі зьяўляцца „пасрэднім доказам" таго, што ён яшчэ лягчэй мог зрабіць усё тое, ў чым ён абвінавачываецца, у той час, калі ня быў паслом.

Абар. Врублеўскі яшчэ раз зварочваецца да суду і заяўляе, што суд ня можа дапусьціць новага сьведку іначай, як захаваўшы паказаныя ў законе гарантыі раўнапраўя старон і што абарона ніколі ня згодзіцца на нарушэньне гэтага падставовага прынцыпу суду.

Суд удаліўся на нараду.

У часе перарыву ў кулуарах гаварылі, што сэкрат раптам выплыўшага дамаганьня пракурора ляжыць у тым, каб да заўтрашняга дня — серада 16 V — да вячэрняга паседжаньня Соймавай Камісіі, разглядаючай пытаньне аб выдачы суду абаіх паслоў, даць у рукі „абвініцеляў" у камісіі агалошанае на судзе праз Каманданта Горадзенскае паліцыі акт „dochodzenia policji" аб п. Баранаве, акт на які *пакуль што ня будзе ніякіх адказаў*.

Суд варочаецца ў залю і выносіць рэзалюцыю: хадатайству пракурора адмовіць.

Вядома, пракурор зусім не такі дрэнны праўнік, каб ня ведаць пра незаконнасьць свайго хадатайства, але як выясьнілася потым у канцы яго прамовы, занадта добры патрыот, каб адмовіцца ад пакусы скарыстаць з выгаднага выпадку — лішняга аргумэнту проціў „шкоднага" пасла.

Аляксандар Парук.

Вучыцель беларускай школы ў Горадні.

Абвінавачаньне проціў А. Парука абаснавана на паказаньнях правакатара Ленкевіча, які называе Парука памоцнікам Трыпуза, начальніка Горадзенскага пав. і цьвярдзіць, што рукою Парука пісаны копіі загадаў Хмары №№ 1 і 2 і ўзор ведамасьці аб становішчы партызанаў і ўзбраеньня.

У часе вобыску знойдзена фатаграфія абв п Баранова.

Кампрамітуючыя Парука паказаньні дадзены на пачатковым сьледзтве, згодна з актам абвінавачаньня, абвін. Грыгорам Астроўскім.

На пытаньне прадсядацеля Парук вінаватым сябе не прызнае. Астроўскага знае і запраўды раз пазычыў яму 5.000 мр. на пакупку дрэва, каб паправіць дом. Але пры гэтым Ленкевіч прысутным ня быў.

Паруку паказываюць пісаныя, быццам, яго рукою загады, ўзор ведамасьці. Прагледзеўшы іх, абвін. заяўляе, што рука ня яго.

На пытаньне судзьдзі Здроевскага, Парук кажа, што Ленкевіч быў у яго два разы. Першы раз Ленкевіч прышоў да абвінав. з Козічам у часе 10 мін. перамены.

Пракурор. Ці знаў абвін. Баранава?

Парук Пазнаёміўся з Баранавым па прыезьдзе ў Горадню па аматорскім сьпектаклю, як з артыстам-аматорам.

Судзьдзя Здроевскі. Адкуль у абв. фатаграфія Баранава, калі вы мала зналі адзін другога?

Парук. Баранаў падараваў фатаграфію, як арганізатар сьпектакля на памяць.

Абар. Врублеўскі просіць прачытаць падпіс на фатаграфіі і паказаць Баранаву.

На фатаграфіі, апрача подпісу Баранава, напісана пабеларуску: „Калі пачаў ісьці—ідзі да канца". Парук выясьняе, што гэта—дэвіз артыстычнага прызваньня. Руку сваю Баранаў прызнае і падцьверджае, што даў Паруку, як і другім артыстам, сваю фатаграфію на памяць.

Абгаварыўшага яго на судзе А. Каляду Парук пытаецца, ці ня быў ён у вастрозе ў варожых адносінах да усіх абвінавачаных. А. Каляда адказывае, што ягонымі прыяцелямі ў вастрозе засталіся Жамойда, Васілюк і Крот; „рэшта чамусьці ня любілі мяне".

Парук выясьняе, што ў вастрозе яго назначалі старшым па камэры № 18, а Каляда пакрыўдзіўся на гэта. Каляда ў вастрозе скардзіўся, што яго білі, хацелі забіць. Але гэта ўсё няпраўда. Цяпер ён і абгаворывае ўсіх нас.

Абар. Врублеўскі. Абвін. Каляда сказаў, што яго ня любілі. Ці ня можа ён сказаць за што?

А. Каляда. Яны казалі, што я хацеў паступіць у польскую паліцыю і служыў у расейскай.

Абар. Врублеўскі А абвін. Каляда падаваў заяву ў польскую паліцыю?

А. Каляда. Але.

Абар. Врублеўскі. І атрымаў адмову?

А. Каляда. Але.

Абар. Врублеўскі. А ў расейскай паліцыі абвін. служыў, ці гэта—няпраўда?

А. Каляда, (заікаючыся). Служыў сэкратаром у паліцэйскага агента.

Казімер Вайткевіч.

Лейтэнант літоўскай арміі.

Як мы ўжо казалі, К Вайткевіч арыштаваны па падазрэньні ў шпіонстве і абвінавачываецца, апрача таго, ў удзеле ў беларускай арганізацыі. У характары афіцэра аддзелу, стаяўшага на пагранічны, Вайткевіч, як паказаў сам у судзебнага сьледаваццеля, прапусьціў па загаду старшага лейтэнанта Разумовіча некалькі вазоў з аружжам і амуніцыяй з Літвы ў Польшчу, між іншым 23 ці 24 лютага 1922 г. 2 вазы праз мост на Нёмне. Апрача таго Вайткевічу ставяць у віну ягонае „polakożerstwo", — прасьледаваньне ў Літве палякаў, ненавісьць да якіх Вайткевіча, быццам, даказана, падосланым у камеру да абвінав. агент. Тустаноўскім.

Абвін. Вайткевіч вінаватым сябе не прызнае. Перайшоў граніцу, адкрыта аддаўся ў рукі ўлады, падаў заяву аб жаданьні служыць у польскай арміі, лічучы сябе палякам, а не літоўцам. Атрымаў як у Лідзе, так і ў Горадні адмову. Тады, ня маючы з чаго жыць, прыехаў да граніцы, каб прабрацца ў Мэрач закупіць цукру і іншых прадуктаў, якія там шмат дзешавей, і прывязьці ў Польшчу. Тут, жадаючы, каб ня бачылі яго ў Польшчы тутэйшыя жыхары, якія езьдзілі праз

граніцу, знали яго і могшыя расказаць там аб ім, хаваўся пакуль сьцямнее ў кустах, дзе яго і знайшоў паліцэйскі патруль. У бытнасьць літоўскім афіцэрам у Мэрачы, выпаўняў загад свайго начальніка. Па загаду Разумовіча прапусьціў два вазы з аружжам праз граніцу, але аб беларускай арганізацыі нічога ня ведаў.

Пракурор пытаецца, чаму гэта цяперашняе ягонае паказаньне знаходзіцца ў супярэчнасьці з паказаньнем у судзебнага сьледавацеля.

Абв. Вайткевіч заяўляе, што сьледавацель у яго нічога ня пытаўся, а маючы гатовы пратакол паліцэйскага дязнаньня, запрапанаваў падпісаць яго.

Пракурор. І абвінавачаны ня чытаў, што там напісана да падпісаньня яго?

Вайткевіч: Не. Ен мне сказаў, што пратакол такі самы, як і састаўлены паліцыяй. Усе яны: і афіцэр і паліцэйскія, казалі мне, што падпісаўшы пратакол, я гэтым аблягчу свой лёс і палепшу сваё становішча ў Польшчы.

Прадс. Але-ж гэта іншая асоба, гэта-ж сьледавацель.

Вайт. Мяне дапрашывалі розныя людзі: ня толькі ў вайсковай форме, але і цывільныя.

На паўторнае пытаньне пракурора абв. Вайткевіч паказывае, што 2 разы прапускаў праз граніцу па 2 вазы, пры гэтым першы раз праз мост на Нёмане. Ніякай Сакалоўскай ён ня знае і не арыштовываў у Літве. Марцінканскага ксяндза ня знае.

Абар. Вайткевіча *Грушкевіч* просіць суд устананавіць, што Вайткевіч сказаў ясна, што ён прызнаў праўдзівым напісанае ў акце дазнаньня аб пропуску ім 4 вазоў з аружжам з Літвы ў Польшчу дзеля таго, што яму сказалі рабіўшыя дазнаньне, што гэткае паказаньне „палепшыць ягоны лёс у Польшчы“.

Язэп Захарчук.

Жыхар в. Бельшчына Бельскага пав.

Даныя акту абвінавачаньня:

Двойчы зьмешчаны ў дакумэнтах „канцэлярыі Шыманюка“: 1) у сьпіску сябраў арганізацыі, атрымліваўшых пэнсію з 1 лютага 1922 г. „нач. сэкцыі, капітан Бельшчыны, мянюшка „Юрка“ і на так званай „liście płac“ служучых аддз. lit. g за люты 1922 г. У Шыманюка-ж знойдзена і фатаграфія з надпісам: „Капітану Захарчуку ад Хмары ў памяць супольнай працы для Бацькаўшчыны. Хмара. 20—I—1922 г.“ Па паказаньням Андрэя Тамашука (разстрэляны) Захарчук быў арганізатарам „баёвак“. Пры арышце ў доме Грыгаса ў Захарчука была знойдзена паперка з адрасам Грыгаса і надрукованы на шапірографе загад нач. адз. lit. g. ад 27 II—1922, камандзірам раёнаў, сэкцый і „ячэек“ аб рэгістрацыі.

На пытаньні суда абв. Захарчук вінаватым сябе не прызнае. Аб арганізацыі нічога ня ведае. Яго мусіць зьмяшалі з другім Захарчуком.. Захарчукоў шмат. Фатаграфія не ягоная, а хіба таго Захарчука, што растрэлялі. Ні Хмары, ні Шыманюка ня знае, як папаў у абодвы сьпіскі ня ведае. 28 лютага прыйшоў да яго Андрэй Тамашчук і сказаў, што запісаў яго ў арганізацыі, ня глядзючы на ягоныя пратэсты. Тамашчук пагражаў, што мяне забьюць, калі я ня ўвайду ў арганізацыю і не паеду па яго даручэньню да Грыгаса.

Пракурор. Янка Захарчук, растрэляны па прыгавару даразнага суду, сваяк абвінавачанага?

Яз. Захарчук. Не. Я—гаспадар, у мяне зямля, сямья, ці-ж магу я належыць да нейкай арганізацыі?

Карней Купрыянюк.

Жых. в. Чыжынкі, Бельскага пав. па праф. тэлеграфіст.

Успамінаецца ў тых-самых двох сьпісках, знойдзеных у „канцэлярыі Скамароха“, як начк. сэкцыі ці аддзела, пад мянюшкай „Капрал“.

Вінаватым сабе не прызнае. Да арганізацыі не належаў. Як папаў у сьпіскі ня ведае. Ніколі ня быў у войску і ніякім начальнікам у вайсковай арганізацыі быць ня можа. Знае толькі сваё тэлеграфнае дзела.

Аляксей Тарасэвіч.

Жых. в. Нова-Бярозаў, Бельск. пав., б. прапаршчык расейскай арміі.

Фігуруе на тых-жа 2 сьпісках, як начк. сэкцыі, мянюшка „Татарын“. Андр. Тамашчук (разстрэляны) паказаў, што Тарасэвіч завэрбаваны ім у арганізацыю, дзе займаўся арганізацыяй „баёвак“. Вінаватым сябе ня лічыць. Як папаў у сьпісак ня мае паняцьця; свае мянюшкі ня ведае, нікога з дзеячоў арганізацыі ня знае.

(*Далей будзе*).

Засьляпленьне.

Сярод згоднага хору польскай чарнасоценнай нацыяналістычнай прэсы, як сталічнай, так і тутэйшай віленскай, закідываючай гразёю беларускі рух наагул, і удзельнікаў беларускага працэсу асабліва,—прыемна пачуць хоць адзін разважны спакойны голас, які зусім іначай ацэнівае прабег падзей і голасна асьцярагае урадовыя кругі Польшчы ад вынікаў іх згубнае нацыянальнае палітыкі. Каб азнаёміць чытачоў з паглядамі гэтай лепшай часткі польскага грамадзянства, цалком падаём у перакладзе, надрукованую пад павысшым загалоўкам стацьцю ў № 10 „Przeglądu Wileńskiego“.

Беластоцкі працэс, кароткую справаздачу аб якім зьмяшчаем на іншым мейсцу, высоўвае паважныя рэфлексыі, якіх аднак-жа мы дарэмна шукалі-б у польскай прэсе, якая плытка ацэнівае непажаданыя для сябе сацыяльна-палітычныя праявы паводлуг шаблоннай схэмы: бальшавіцка-нямецка-літоўскіх (абвімаючы на гэты раз масонскіх) махінацый.

У даным выпадку справа зусім ня ў тым, з чыей дапамогі карысталі загаворшчыкі-беларусы, варт увагі сам факт утварэньня паўстанчай арганізацыі на тэрыторыі Заходняй Беларусі, а значыцца ў тэй частцы нашага краю, якая лічыцца ў асьвятленьні ўрадовай статыстыкі і палітыкі, як найбольш зьвязанай з польскай культурай і дзяржаўнасьцю. Варшаўскія справаздаўцы падкрэсьліваюць, што загавор ня меў вялікіх разьмераў і з гэтага робяць вывад, што мяйсцовая люднасьць ня спрыяла мэтам арганізацыі. Слабая пацеха. Каб было іначай, дык становішча было-б проста грозным. Але і так надта паказацельна, што загавор раскрыты толькі дзякуючы правакацыі Гэта відавочны довад, што арганізацыя вяла сваю дзеяльнасьць на грунце спрыючым і падатным для ейнай агітацыі, калі знаходзіла чынных працаўнікоў, спрыючых альбо ў найгоршым выпадку адсутнасьць зацікаўленасьці, але не спатыкалася з яўнаю працівадзейнасьцю з боку люднасьці.

Так сама ня мае вялікшага значэньня акал ічнасьць, што частка загаворшчыкаў пашла па дарозе звычайнага бандытызму. Гэта звычайнае зьявішча, што арганізацыя, створаная для аружнай дзейнасьці, змушаная да чаканьня, з прычыны бязьдзеяльнасьці хутка падлягае дэмаралізацыі і перарабляецца у банды грабежнікаў. Гэткія зьявішчы можна было не адзін раз бачыць у баёўках P. P. S., P. O. W. (Польская вайсковая арганізацыя) і ім падобных палітычных канспірацыйных арганізацыях, маючых пры заснаваньні безсумліўна ідэёвыя мэты.

Адкінуўшы аднак-жа ўсялякія зварочываньні ў бок, пабочныя і прыпадковыя ўплывы і наслаеньні, трэба прызнаць, што працэс беластоцкі выявіў аснаўную падробнасьць: пашырэньне і спробы чыннае барацьбы знаходзячыя сабе грунт у той часьціне краю, якая беспасрэдна мяжуецца з этнаграфічнай Польшчай.

Выкрыцьцё загавару і ліквідацыя данай паўстанчай арганізацыі не дае ніякай гарантыі, што праявы гэтага роду ня будуць паўтарацца ў будучыне. Жорсткія рэпрэсіі не пазбавілі тых прычын, якія выклікаюць падобныя настроі і вынікаючыя з іх чыны. Што раз выразьнейшы кірунак у беларускім руху, зазначаючы сваю варожасьць да Польскай Дзяржавы, красамоўна сьведчыць, што польская палітыка адносна да беларускага пытаньня знаходзіцца на фальшывай дарозе, якая вядзе да неаблічальных на разе вынікаў.

Калі бачым, адбываючуюся на вачох, гэтую эвалюцыю ў беларускім руху, калі паглядаеш, як здэцыдаваныя палянафілы, пад уплывам рэпрэсый і выбрыкаў неакелзанага польскага нацыяналізму, зьмяняюць сваю арыентацыю, зьдзіўленьне ахоплівае перад нязразумелым засьляпленьнем кіраўнічых чыньнікаў у польскай палітыцы, якім асоба маршалка Фоша засланяе ўвесь гарызонт.

Невылячымая катаракта!

Развага аб нашым жыцьці.

— Слухай, дружа, што-ж гэта будзе з нашым жыцьцём?

— Пакуль арыштавана № 1, а там чырык і гатова.

— Ды не, я наагуль аб нашым жыцьці.

Гм... тэма казатлівая, а не сканфіскуюць нас?

— Дык ты кажы тое, што думаем, а думаць пакуль кожнаму можна. Ды ўрэшце-ж жывем мы дзе канстытуцыя...

— Цсс...

— Я ж нічога нецэнзурнага не кажу. Я хочу толькі зазначыць, што мы беларусы хочым жыць па закону і замагаемся, каб закон гэты шанаваў той, хто яго пісаў. Нам павінны быць удзячны, што мы вядзём іх да грамадзкай дасканальнасьці, што мы іх палітычную думку вылечываем ад дзікіх нарастаў панскай ідэалёгіі, —прыбліжаем да сацыялізму...

— Цсс... не загаварывайся. Не забывайся, што барацьба наша за соцыяльнае і нацыянальнае права разгараецца, пропасьць паглыбляецца. Уціск друкаванага слова сьведчыць аб гэтым. А трэба табе заўважыць, што друкаванае слова—наймацнейшае аружжа ў сучаснасьці і робіцца для супраціўніка нават дужа небясьпечным, калі яго заганяюць у падполье, калі гэтае слова робіцца агністым і крылатым.

— Цяжка. Нават за перадрукі з польскіх газэт канфісковываюць.

— Э, пакінем мы казаць аб крыўдзе і законе. Калісьці нашы дзеці, а то як пашанцуе, дык і мы самі, будзем аб гэтых блізнецах успамінаць у часе бясед, расказываць як вясёлыя анэкдоты.

— А я наадварот, хачу гутарыць аб тым, што мне баліць, чым мы жывем, гутарыць аб нашым жыцьці.

— Але, будзем гутарыць аб нашым жыцьці, аб нашай усёўзрастаючай веры ў моц нашых гартованых працай—духа і рук, аб усё шчыльней зьедналых шарэнгах сялянскіх сыноў, якія дружна адклікаюцца падпіскай, ахвярамі і допісамі ў нашыя газэты. Будзем гутарыць аб тым, што разумеем, разгадываем патрэбы і мэты сялян, а яны верацць нам і падтрымовываюць моральна і матэр'яльна. Вельмі ўжо мізэрная і гідзенькая акружаючая нас сучаснасьць перад велічам нашай будучыны, каб яна магла атручываць нашае жыцьцё, разьбіваць нашу еднасьць. Мы стаім на сумежнасьці фашызму і соцыялізму. Сярэдзіны няма!—гэта-ж так выпукла, пераканаўча адчуваецца. Мы, як працоўныя, павінны ведаць куды прымкнуць, каб абясьпечыць свой дабрабыт і права. А ўсе іншыя пытаньні—сямейная справа — разгледзяцца без крыўд у супольным, саюзным сужыцьці сапраўды вольных з вольнымі, роўных з роўнымі. Фашызм—гэта часовае, пераходнае, а мо апошняе выступленьне капіталізму. Нашыя мэты—агульна-людзкія, жыцьцёвыя, ідучыя ад зямлі і машын і дзеля таго і нашае жыцьцё здаровае і вечнае, і на нашым баку немінучая пабеда. Усім эразумела... Але я разагнаўся, магу дагутарыцца да канфіскаты.

— А гэта таксама з нашага жыцьця...

Р. Юргілевіч.

Палітычныя падзеі.

Японія. Савецкая прэса паведамляе, што Японія стаіць у пярэдадні рэвалюцыйнага перавароту. Гэтыя весткі падцьвярджае і токійскі карэспандэнт „Berliner Tageblatt“.

Лазанская Канфарэнцыя. Паміж туркамі і грэкамі дайшло было да вострага канфлікту з прычыны устанаўленьня новай граніцы, З абодвых бакоў распачалася была канцэнтрацыя войска, але неяк, дзякуючы націску Антанты дайшлі да згоды. Грэцыя уступіла для Турцыі тэрыторыю ў 25 кв. кілом.

Рурскі басэйн. Забастоўка пашыраецца, захапліваючы новыя раёны і галіны прамысловасьці. У Джюсельдорфе бастуюць усе большыя прадпрыемствы. Трамваі ня курсуюць. У Эсэне вядуцца перагаворы аб утварэньні работніцкай міліцыі. У Бохуме забурэньні трываюць далей. Арыштавана 200 камуністаў.

Францыя. Французскі камуністы пас. Кашэн выпушчаны на свабоду. З гэтай прычыны дайшло да непаразуменьня паміж Пуанкарэ і францускім сэнатам, які выпаўняе адначасна і функцыі Высшага Трыбуналу. Сэнат адмовіўся судзіць Кашэна за яго палітычныя пераконаньні. Пуанкарэ прыняў гэта за вотум недаверыя і падаўся ў адстаўку, але прэзыдэнт адстаўкі ня прыняў. Пуанкарэ ў барацьбе з нямілым яму паслом гатоў нават на пагвалчэньне канстытуцыі, ў абароне якой ён быццам стаіць.

Англія. Перамены ў кабінэце міністраў ня выклікаюць ніякіх перамен ў кірунку ангельскай палітыкі, якая нічым ня будзе рожніцца ад кансэрватыўнай палітыкі Бонар-Лоу.

Польшча. Прадстаўлены Сойму праэкт бюджэту прадбачыць кошт утрыманьня дзяржаўнай паліцыі ў суме 235.251 497.000 м. п., ня лічучы утрыманьня высшых установаў, самога міністэрства ўнутраных спраў, ваяводстваў і старостваў, а таксама выпаўняючай абавязкі паліцыі пагранічнай стражы. Усіх паліцэйскіх налічываецца 37.191, што пры 25 мільёнах люднасьці прыходзіцца **1 паліцыянт на 675 жыхараў!** Пры так вялікім ліку паліцэйскіх задзіўляе вялікі працэнт крымінальных праступленьняў, а перадусім **нявыкрыцьце гэтых праступленьняў!**

Пасол Луцкевіч у Празе.

Украінскі пасол Марка Луцкевіч, выданы праз Польскі Сойм, выехаў патаемна да Прагі-чэскай, дзе адразу прыняў чынна удзел у дзеяльнасьці украінскай эміграцыі.

Па загаду камісара ўраду гор. Вільні сканфіскавана першы нумар „Нашага жыцьця“ за артыкулы: 1 „Першы палітычны працэс беларусаў. Барацьба проціў беларускай нацыянальнай ідэі“. 2. „Начны сьветагляд“—верш Л. Р. 3. Карэспанцэнцыя: „Вайна пачалася“.

Карэспандэнцыі.

М. Радашковычы.

Нашая гміна Рыжскім мірам падзелена на дзьве часткі На гэтым баку знаходзіцца толькі паўтары вобчэства, якое мусіць утрымаць адміністрацыю гміны: войта, пісара, двух памошнікаў і стоража-усяго пяць асоб. Кожны сялянін мусіць плаціць па 6000 м. з дзесяціны на іх утрыманьне. А калісь, калі гміна складалася з 5 вобчэстваў, дык утрымывала толькі двух: старшыню і стоража, але-ж гэта былі царскія часы.

Але войт не зважае што сялянам шмат каштуе яго міласьць і патрабуе яшчэ сабе „за труды“, як гэта недаўна было з селянінам з вёскі Максімаўка.

N.

Безбаронная.

У прыгранічнай вёсцы Руча, Даўгінаўскай гм., Вялейскага пав. жывець кабеціна Наста—удава, мае сямёра дзяцей. Самаму старшаму трынаццаць гадоў. Кабета гэтае жывець дужа бедна, зарабляе на пражыцьцё прадзівам воўны і лёну.

Атрымаўшы раз плату за сваю працу верталося дамоў. Яе сустрэлі прыгранічныя жаўнеры адабралі ад яе грошы і пасадзілі пад арышт за тое, што быццам яна давала ім „łapówki“. А тым часам сямёра дзяцей галадаець.

Праездны.

Беларускі Дзяржауны Тэатр у Бабруйску.

У пачатку траўня месяца дырэкцыя падгатавала выезд нашага тэатру ў Бабруйск, і 6—9 мая бабруйчане ўбачылі лепшыя пастаноўкі Дзярж. Тэатру („Машэка“, „На Купальле“ і „Жрец Тарквіні“).

Яшчэ „Машэка“ прайшоў пры паўнюткай салі, але бяз бурнага напльву публікі ў касу. „На Купальле“ і „Жрэц Тарквіні“ ішлі ўжо з аншлагамі далёка раней ад пачатку спэктакля і нявіданыя чаргі публікі ля касы вялі такі націск, што дзеля парадку прышлося вызываць належных даглядчыкаў яго. Бурныя воплескі, поўная ціша ў салі пры спэктаклях, тое нястрымліваемае зьдзіўленьне посьпехам і дасяганьням Дзярж. Тэатру, якія выразна выказвала сабраўшаяся бабруйская публіка - усё гэта сьведчыць што наш тэатр павінен як часьцей рабіць такія выезды ў правінцыю, якая згаладалася па добрых тэатральных пастаноўках.

Асабліва ўражаньне пакінуў „Жрэц Тарквіні“ з яго пышным надворным бокам і мастацкімі масавымі сцэнамі ў храме. У салі сярод публікі стаяла затаёная ціш. Публіка чутка лавіла кожнае слова.

Ніводная трупа, якая прыязджала ў Бабруйск на гастролі, не карысталася, як кажуць бабруйчане, такім посьпехам, як трупа Беларускага Дзяржаўнага Акадэмічнага Тэатру.

9 мая, перад ад'ездам у Менск, Дзерж. Тэатр даў чыгуначнікам дарэмны канцэрт бел. хору з дэклямацыяй. Канцэрт сабраў ня толькі чыгуначнікаў, але і шмат публікі з места, якая прыйшла на вакзал, каб толькі паслухаць дзярж хор

З Менску.

Ахова здороуя дзяцей.

Гарадзкім Аддзелам Аховы Здароўя зроблены дэтальны абгляд дзяцей дзіцячых дамоў. Дамы былі ачышчаны і дэзынфэкцыраваны. У часе чысткі дзеці выдаляліся ў асобныя ізалятары. У школах уведзены інстытут дактароў гігіеністаў. Пры цэнтральнай дзіцячай амбулаторыі істнуе габінэт па фізычнаму і маральнаму дасьледаваньню разьвіцьця дзяцей. Робіцца сыстэматычнае мэдыцынскае абсьледаваньне падросткаў і прафшкольцаў. Абсьледаваны з санітарнага боку профшколы, фабрыкі іншыя ўстановы дзе ужываецца праца падросткаў.

У Бел. Дзярж. Ін-це Сел. Гаспадаркі

Прыехаў з цэнтру выдатны прафэсар, доктар заолёгіі Сініцын, быўшы рэктар Ніжагародскага Унівэрсытэту.

З восені ён пачне чытаць у Інстытуце лекцыі па заолёгіі.

Пісьмо ў рэдакцыю.

Паважаны грам. Рэдактар!

Ня маючы ахвоты чытаць такія польскія газэты і выданьні, у якіх справа беларуская толькі ганіцца і ў якіх над усім, што ёсьць беларускага, толькі зьдзекуюцца, — я сваячасна не зьвярнуў увагу на агідную брахню „невядомага“ аўтара, напісаўшага у № 654 газэты „Myśl niepodległa“ артыкул: „Rewelacje posła Kochanowicza“.

Вельмі дзякую „невядомаму“ аўтару за рэкламу маёй асабістасьці, якой я не заслужыў, але думаю, што і ў рэкламаваньні трэба быць хоць трошкі чэсным і суменным.

У гэтым артыкуле паміж іншымі інсынуацыямі па майму адрасу „няведамы“ аўтар кіруецца прадставіць мяне вось якім.

„Было гэта так:

На адным з таварыскіх сходаў у Вільні, група беларускіх дзеячоў абгаварвала вядомую дэклярацыю Беларускага Варшаўскага Камітэту з прычыны прызнаньня Польскіх граніц на ўсходзе праз Антанту. Галасы падзяліліся. Адны выказваліся за дэклярацыю, якая выражала жаданьне згоднага сужыцьця з палякамі, другіх агарнулі нейкія скрупулы. Дыскусыю пераціяў, як нажом, пасол Кахановіч“:

— „Што? беларуская дэклярацыя? Прызнаньне граніц? Сколькі вам польскі ўрад заплаціў за тую дэклярацыю? Але вы памыліліся! Тут ня будзе ніякай Польшчы, а паўстане Савецкая Беларусь! Зразумелі?, Савецкая!, У адзін мамэнт усіх паноў і ксяндзоў пад сьцяну і з кулямёту; ды усялякіх, Дубейкоўскіх і Ладновых, якія падпісалі дэклярацыю, так сама пад сьцяну і з кулямёту! Цяпер ужо зразумелі?

— Слухачы зразумелі, адубелі і на ўсялякі выпадок замоўклі“...

Гэтым маю гонар сцьвердзіць, што ніколі, нідзе і ні на якім сходзе я такой прамовы не казаў. Здаецца мне, што „невядомы“ аўтар мае тут на увазе мае прыпадковае спатканьне ў кватэры сямьі Гарэцкіх з панам Дубяйкоўскім, спатканьне на першы дзень праваслаўнага Вялікадня ў Вільні. Прысутнымі былі: Л. Гарэцкая, яе матка, п Дубейкоўскі з жонкаю і потым прышоў я. Пасьля звычайных сьвяточных размоў, перайшлі на палітычныя тэмы. Я запытаўся ў п. Дубейкоўскага аб выпушчанай ім і п. Ладновым „Беларускай дэклярацыі“, у якой гэныя паны выказвалі сваю і Варшаўс. Белар. К-ту, радасьць з прычыны прызнаньня Радаю Амбасадораў усходніх граніц Польшчы. П. Дубейкоўскі адразу стаў аднеківаццa што ён нічога ня ведае і што дэклярацыю выпусьціў Ладноў, надужыўжы яго Дубейкоўскага імя без яго на тое згоды.

Ведаючы, што п. Дубейкоўскі гаворыць няпраўду, звальваючы усё на Ладнова, я сказаў яму аб гэтым у вочы і потым запытаў: як паміры́ць папярэднюю дзеяльнасьць п. Дубейкоўскага, выступаўшага за незалежнасьць і *непадзельнасьць* Беларусі з яго цяперашняю радасьцяй з прычыны прызнаньня граніц Польшчы. г. ё. разьдзелу Беларусі. П Дубейкоўскі ня мог мне даць належнага адказу, з прычыны чаго я зусім шчыра яму сказаў, што падобныя выступленьні, яўна скіраваныя проціў інтарэсаў беларускага народу, могуць рабіць альбо тыя беларусы, якія перайшлі ўжо ў польскі лягер па тых ці іншых карысных дзеля іх матывах і перасталі фактычна быць беларусамі, альбо тыя „białorusini“, якія заўсёды былі скарэй белаляхамі, чым беларусамі, і толькі да пары да часу прыкідываліся гэтымі апошнімі.

Да гэтых апошніх я і залічыў п. Дубейкоўскага Вось сутнасьць маіх слоў адносна п. Дубяйкоўскага, сказаных яму пры спатканьні ў п. п. Гарэцкіх.

Відаць, што гэтыя мае словы і паслужылі „невядомаму“ аўтару (ці ня ведае яго п. Дубяйкоўскі?) зачэпкаю для інсынуацый у „Myśl Niepodległej“, якая называе мяне былым расейскім бюрократам, рэдактарам урадовых „Магілеўскіх Губэрскіх Ведамасьцяў“, расейскім сацыял-рэвалюцыянэрам, беларускім нацыяналістам з таго абозу, які пасылаў вернападданыя тэлеграмы Вільгельму, конспіратарам, таварышом, які гатоў ксяндзоў і папоў, а так сама Дубяйкоўскага і Ладнова, паставіць пад сьцяну і з кулямёту...

Ніколі я ня быў бюракратам, бо заўсёды быў толькі вучыцялем сярэдніх школ. Ня быў я і рэдактарам урадовых „Маг. Губ. Вед.“

Да партыі расейскіх сацыялістаў-рэвалюцыянэраў я там сама ніколі не належаў, а быў гадоў 20 таму назад у вучнёўскім рэвалюцыйным гуртку ў Менску. Так сама я быў вельмі далёкім да таго абозу беларускіх нацыяналістаў, які пасылаў у свой час тэлеграмы Вільгэльму. Канспіратарам мне прыходзіцца быць, як і ўсякаму чалавеку, якой бы палітычнай маркі ён ня быў. Панам Дубяйкоўскаму і Ладнову, я думаю, больш прыходзіцца конспіравацца ў сваёй палітычнай—(!?) акцыі, чым каму-небудзь. Што ж датычыць „пад сьцяну і з кулямету“, то і сам пан Дубяйкоўскі добра ведае, што „няведамы“ аўтар сьвядома і прытым умысна злосна тут збрахаў для „закончанасьці характарыстыкі“, для паўноты карціны, а можа, каб начальства пахваліла...

У канцы гэтага пісьма павінен яшчэ адзначыць, што падняўся я бараніцца перад інсынуацыямі не з прычын асабістых, а грамадзянскіх, бо бачу, што ў апошнія часы ў значнай часьці польскай чорнай прэсы вядзецца пляновая кампанія проціў паасобных беларускіх дзеячоў, пераважна дэпутатаў Сэйму, якіх за ўсякую цану хочуць палітычна абязславіць.

Прашу іншыя газэты перадрукаваць.

Міхал Кахановіч,
пасол Сойму.

1923 г. 29 трауня
Вільня.

Бібліяграфія.

„*Полымя*“ № 3—4.

Выйшаў у Менску з друку беларускі месячнік «Полымя» № 3—4 за люты і сакавік г. г, Зьмест нумару:

1. **М. Чарот**—„Чырвоныя вясьнянкі“—верш.
2. **Цішка Гартны**—„Беларускі народ“, „Я іду да ўсходу“—вершы,
3. **Тарас Гушча**—„Сяргей Карага“—апавяданьне.
4. **Ц. Гартны**—„Трэскі на хвалях“—апавяданьне.
5. **Я. Журба** — „Спатыкаць пайду вясну“, „Вясной“—вершы.
6. **Н. Чарнушэвіч**—„Вясна“, „Набягаючы дзень“—вершы.
7. **Я. Плашчынскі**—«Новы дзень»—верш.
8. **А. Александровіч** — «Разводзьдзе», „Возера“—вершы.
9. **А. Гурло**—«Раніца», «На моры», «У дарозе»—вершы.
10. **А. Моркаўка**—«Калыханка»—вер.
11. **М. Байкоў**—«Пазнаньне Беларусі, як навуковая і рэвалюцыйна-грамадзянская праблема»—артыкул.
12. **Жылуновіч**—«Два бакі беларускага руху»—артыкул.
13. **Н.** — «Беларуская школа, як фактар культуры беларуск. пралетарыяту»—артыкул.
14. **І. Цьвікевіч**—„Банкроцтва беларускай эміграцкай акцыі ў Літве“, „Анты сацыялістычнае беларускае гнязло“—артыкулы.
15. **Я. Пятровіч**—„Эканамічнае становішча Беларусі“.
16. **А. Сянкевіч**—„Успаміны з рэвалюцыі 1905 - 1906 г.г.“
17. Літэратура, кнігапісь, хроніка бел. культуры.

Усяго—180 стр.

Усячыиа.

Гнілы Захад.

За апошнія часы ў Англіі узьнялася эпідэмія самагубстваў сярод усіх слаёў вобчэства, асабліва-ж сярод вялікіх арыстакратычных семьяў. Хронікі газэт перапоўнены самымі небывалым выпадкамі самагубстваў.

Недаўна ў Лёндане вядомая краля з вышэйшых кругоў вобчэства па прозьвішчу Лебо на 22 гаду жыцьця забіла свайго мужа, а пасьля выстралам у галаву пакончыла з сабой. Самагубка пражыла шчасьліва 4 гады з сваім мужам. Яе нашлі няжывой у крэсьле з вянком жывых красак, у шлюбнай вопратцы. У пасьмертнай запісцы было напісано: „Лепш памерці пакуль каханьне яшчэ моцнае і маладое“.

Прысуд над Беларусамі!

Акружны Суд у Беластоку, абвінавачаных у вядомым працэсе беларусаў за аружнае паўстаньне проціў Польшчы прыгаварыў: С. Баранава і В. Маслоўскую па 6 гадоў, Алексея Станкевіча на 5 гадоў, Аўгеню Матэйчук на 3 гад. катаргі, Ал. Гораша, Кір. Барташука, С. Жабінскага і Грыгаса на 3 гады, Гр. Каляду, Яз. Захарчука, А. Парука на 2 г. Кл. Жамойду на 1 г. і 6 м. і Стасюка на 1 г. А. Нічыпарука, А. Захожага, Хв. Крата па аднаму году. Рэшта абвінавачаных апраўданы.

На прэсавы фонд зложылі: Служачыя Беларускага Аддзелу пры Міністэрстве Асьветы у Латвіі—112 латсаў, Цлыгавко—6000 м. Ністановіча А. 5000 мк.

Беларускае Грамадзянскае Сабраньне

з прычыны закончэньня конкурсу, прапануе аўтарам, даваўшым на конкурс пьесы, забраць іх, а аўтарам: **„П. С. Х.“**, **„Жыцьце і каханьне“** і **„Янка Канцавы“**, апрача таго і **прэміі.**

Рэдактар-выдавец В. Прохараў. Друкарня Дворжэца, Завальная 32.